гісторыі роду Радзівілаў. У 1757 яшчэ адна майстэрня створана ў Камянцы. У 1762 усе майстэрні пераведзены ў Карэлічы, дзе праца над шпалерамі прадоўжана (гл. *Карэліцкія шпалеры*).
*В.С.Пазднякоў.*

**НЯСВІЖСКАЯ ЗАМКАВАЯ ВЕЖА**, помнік архітэктуры 2-й пал. 16 ст. ў г. Нясвіж Мінскай вобл. Уваходзіць у комплекс *Нясвіжскага касцёла езуітаў*. Першапачаткова складалася з нізкай шатровай брамы (злучала горад з замкам; не захавалася) і высокай абарончай вежы. Вежа — квадратнае ў плане збудаванне, завершанае шатровым дахам. Глухі ніжні ярус з контрфорсамі вырашаны як масіўны цокаль. 2-і ярус аформлены прамавугольнымі, круглымі і квадратнымі аконнымі праёмамі, 3-і і 4-ы — арачнымі. Белыя атынкаваныя абрамленні праёмаў і між'ярусныя паяскі кантрастуюць з чырв. цаглянай муроўкай сцен, што ствврае дэкар. 2-колерную гаму фасадаў. У архітэктуры вежы алюстраваны рысы бел. абарончага дойлідства, стыляў готыкі і рэнесансу.
*М.А.Ткачоў.*

**НЯСВІЖСКАЯ КАПЭЛА РАДЗІВІЛАЎ**, прыдворны аркестр кн. *Радзівілаў* у г. Нясвіж Мінскай вобл. ў 1724—1809. Засн. кн. М.К.Радзівілам. Іграла ў час баляў, свят, ваен. парадаў, касцельных службаў, з 1746 і тэатр. паказаў. Выступала таксама ў загарадным палацы ў Альбе, суправаджала радзівілаўскія выезды ў вотчыны Белае, Мір, Жоўква, Алыка. Да 1746 мела камерны характар і складалася з замежных музыкантаў (італьянцаў, немцаў, чэхаў), пазней яе склад павялічыўся (пераважалі палякі, беларусы, літоўцы). У 1751 пры ёй адкрыта *Нясвіжская музычная школа*. У 1733—80 сярод найб. вядомых музыкантаў капэлы *Мацей з Карэліч* (скрыпка), Ф.Яжомбек, Я.Баэрт, Я.Б.Сухенгаўз (клавіцымбалы), Кёнігцэр (флейта), Я.К.Фішэр (габой), Нойверт (арфа), Ф.Гофман (фагот), Вентцэль (валторна), Ю.Кагут (лютня) і інш. Капельмайстры: скрыпачы Е.А.Бакановіч (з 1749), Ян Цэнціловіч (з 1751), дырыжоры Ф.Вітман (з 1756), Я.Шоль (і клавесін, з 1761), Д.Кёрнер (з 1770). У 1780 К.С.Радзівіл запрасіў вядомых музыкантаў Дж.Альберціні (клавесін, капельмайстар у 1783—84), Дж.Канстанціні (скрыпка), І.Фляйшмана (віяланчэль), Я.Дусіка (фп.), Я.Д.*Голанда* (клавесін, капельмайстар у 1782—1802), спевакоў В.Нікаліні, А.Калаўзека, А.Данезі, спявачак К.Вертэр, Герман. Апошні капельмайстар мясц. валтарніст А.Александровіч (1804—08).

*Літ.*: Гісторыя беларускага тэатра. Т. 1. Беларускі тэатр ад вытокаў да Кастрычніка 1917 г. Мн., 1983. С. 182—183, 189; Музыкальный театр Белоруссии: Дооктябрьский период. Мн., 1990. С. 174—177.

**НЯСВІЖСКАЯ МАНУФАКТУРА ШАЎКОВЫХ ПАЯСОЎ**. Дзейнічала ў г. Нясвіж Мінскай губ. ў 1-й пал. 18 ст. Працавала больш за 50 прыгонных. Прадукцыя не вытрымала канкурэнцыі са *слуцкімі паясамі* і была закрыта.

**НЯСВІЖСКАЯ МУЗЫЧНАЯ ШКОЛА**. Існавала ў 1751—1809 (?) пры *Нясвіжскай капэле Радзівілаў*. Рыхтавала выканаўцаў-інструменталістаў і вакалістаў для капэлы і *Нясвіжскага тэатра Радзівілаў*. Вучыліся дзеці сялян з Нясвіжа і навакольных вёсак. Ігры на скрыпцы, віяланчэлі, флейце, габоі, фагоце, валторне, трубе, а таксама вакалу навучалі лепшыя музыканты і спевакі капэлы: Ф.Вітман (да 1780-х г.), Я.Д.*Голанд*, Я.Дусік, Дж.*Альберціні*, І.Фляйшман, Дж.Канстанціні, В.Нікаліні (усе 1780-я г.) і інш. Верагодна, у школе атрымалі пач. муз. адукацыю прыгонныя скрыпачы *Мацей з Карэліч* і Я.*Цэнціловіч*.
*В.П.Пракапцова.*

**НЯСВІЖСКАЯ НАСТАЎНІЦКАЯ СЕМІНАРЫЯ**, навучальная ўстанова, якая рыхтавала настаўнікаў пач. школ. Створана ў 1875 у Нясвіжы замест закрытага дамініканскага кляштара па ініцыятыве міністра асветы Расіі графа Дз.А.Талстога і папячыцеля Віленскай навуч. акругі М.А.Сергіеўскага як «асветны і адукацыйны фарпост, які будзе служыць адпорам польскаму каталіцызму». У розны час у Н.н.с. выкладалі К.Ф.Шчансновіч, С.А.Кулагін, І.Ф.Нікалаеўскі, П.Р.*Бывалькевіч*, Л.К.Лычкоўскі, Ф.В.Лукашэвіч, С.А.Гурыновіч, Ф.А.*Кудрынскі*, ксёндз В.*Гадлеўскі* і інш. Тэрмін навучання 3—5 гадоў. Фінансавалася з дзярж. бюджэту. Мела фіз. і прыродазнаўчы кабінеты, хім. лабараторыю, актавую залу, клас для заняткаў ручной працай, інтэрнат для навучэнцаў. Пры семінарыі дзейнічала ўзорнае пач. вучылішча, метэаралаг. станцыя (з 1900), музей (з 1910). У 1914 у фундаментальнай б-цы 3630 тамоў, у вучнёўскай — 1710. У жн. 1915 семінарыя эвакуіравана ў г. Вязьма Смаленскай губ. У час бежанства на вучобу прымаліся пераважна выхадцы з Беларусі. Пасля Лют. рэвалюцыі 1917 у Н.н.с. дазвалялася прымаць асоб неправасл. веравызнання і жан. полу; створаны бел. вучнёўскі культ.-асв. гурток «Прасвета». Летам 1917 семінарыя рээвакуіравана ў Нясвіж. У час польскай акупацыі 1919 падпарадкоўвалася *Беларускай школьнай радзе Меншчыны*. У розны час у семінарыі вучыліся А.*Галіна*, А.*Багдановіч*, П.*Дземідовіч*, К.Міцкевіч (Я.*Колас*), В.Камлюк, А.Сташэўскі, В.Сташэўскі, М.Раманоўскі (К.*Чорны*) і інш. Закрыта ў снеж. 1919.
*У.В.Ляхоўскі.*

**НЯСВІЖСКАЯ РАТУША І ГАНДЛЁВЫЯ РАДЫ**, помнікі архітэктуры 16 ст. ў г. Нясвіж Мінскай вобл. Р а т у ш а ўзведзена каля 1596 з цэглы на б. Рыначнай пл. Перабудавана ў 1752 у стылі позняга барока. Прамавугольны ў плане 2-павярховы будынак з 6-яруснай вежай (4 ніжнія чацверыкі, 2 верхнія васьмерыкі), завершанай гранёным купалам з ліхтаром. У 1836 пажарам знішчана завяршэнне вежы. У сярэдзіне 19 ст. чацверыкі накрыты пакатым шатровым дахам; асн. аб'ём — высокім кроквенным дахам з вальмай на паўд. тарцы. У 1990-я г. адноўлена ў першапач. выглядзе паводле праектнага плана канца 16 ст. і гравюры Т.Макоўскага 17 ст. Фасады амаль пазбаўлены дэкору. Узроўні ярусаў вежы і памяшканняў ратушы не супадаюць і злучаны драўлянымі ўсходамі. Г а н д л ё в ы я р а д ы спачатку размяшчаліся сіметрычна абапал ратушы па даўжыні будынка. Паміж імі былі неширокія праезды з арачнымі брамамі на тарцах. Ячэйкі-крамы былі адкрыты праёмамі ў бок праездаў; частка гандл. памяшканняў знаходзілася ў 1-м ярусе ратушы. У сярэдзіне 18 ст. гандл. рады перабудаваны: прадоўжаны за будынак ратушы, абкружылі яе з трох бакоў, утвараючы П-падобны ўнутр. замкнёны дворык; ячэйкі-крамы пераарыентаваны праёмамі да плошчы і прылеглых вуліц. Невысокія падоўжаныя карпусы гандл. радоў накрыты 1-схільнымі дахамі (са схілам у бок унутр. двара). Вулічныя фасады вырашаны ў выглядзе аркады, завершаны высокім атыкам. У дэкоры выкарыстаны прафіляваныя карнізы, абрамленні праёмаў, філянговыя нішы.
*Т.В.Габрусь.*



Нясвіжская ратуша і гандлёвыя рады.



Нясвіжская Слуцкая брама.

**НЯСВІЖСКАЯ СЛУЦКАЯ БРАМА**, помнік архітэктуры барока ў г. Нясвіж Мінскай вобл. Пабудавана ў 1690 на месцы брамы 16 ст., перабудавана ці адноўлена ў 1700 (паводле інш. звестак у 1760) на дарозе-дамбе ўздоўж возера,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ